# Распараджэнне

# Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

7 чэрвеня 2024 г. № 98рп г.Мінск

Аб падтрымцы культуры і мастацтва

1. Зацвердзіць рашэнне савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва (дадаецца).

2. Міністэрству культуры выдзеліць у 2024 годзе са сродкаў фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва 1 250 000 рублёў на ажыццяўленне выплат у адпаведнасці з рашэннем, указаным у пункце 1 дадзенага распараджэння.

3. Кантроль за мэтавым выкарыстаннем сродкаў, выдзеленых згодна з пунктам 2 дадзенага распараджэння, ускласці на Камітэт дзяржаўнага кантролю і Міністэрства культуры.

Прэзідэнт
Рэспублікі Беларусь А.Лукашэнка

АДМИНИСТРАЦИЯ ПРЕЗИДЕНТА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ • 1 •
Для правовых актов

10

ЗАЦВЕРДЖАНА

Распараджэнне Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
07.06.2024 № 98рп

РАШЭННЕ
савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь
па падтрымцы культуры і мастацтва

18 студзеня 2024 г. пратакол № 1 г.Мінск

Выдзеліць:

па хадайніцтве Віцебскага аблвыканкама Полацкаму райвыканкаму на правядзенне работ на аб’екце ”Рэканструкцыя з комплекснай рэгенерацыяй Спаса-Еўфрасіннеўскага стаўрапігіяльнага жаночага манастыра ў г.Полацку Беларускай Праваслаўнай Царквы“ 1-я чарга будаўніцтва. Трапезная“ за кошт адлічэнняў за прадпрымальніцкую дзейнасць, якая аказвае непасрэднае ўздзеянне на гісторыка-культурныя каштоўнасці або зоны аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; кампенсацый за шкоду, прычыненую гісторыка-культурным каштоўнасцям або зонам аховы нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей; бязвыплатнай (спонсарскай), у тым ліку замежнай, дапамогі, ахвяраванняў; іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам, на спецыяльны пазабюджэтны рахунак Міністэрства культуры – 1 000 000 рублёў;

дзяржаўнай тэатральна-відовішчнай установе ”Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь“ на стварэнне творчага праекта ”Патэтычны дзённік памяці“ за кошт асігнаванняў з рэспубліканскага бюджэту – 250 000 рублёў.

Старшыня савета фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы культуры і мастацтва — Н.У.Карчэўская